**Тэма:** “Я і мая Малая радзіма”

**Мэта:** фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызма, нацыянальнай самасвядомасці.

**Задачы:**

- пашырыць веды навучэнцаў пра родны аграгарадок, Ганцавіцкі раён, Рэспубліку Беларусь;
- развіваць пазнавальнасць, творчасць;
- выхоўваць пачуццё гордасці за сваю Радзіму;

**Абсталяванне:** фотаздымкі, мультымедыйная прэзентацыя, старонкі віртуальнага музея, выстава работ народнага майстра.

**Эпіграф:**

Мая маленькая радзіма,
Заўсёды сэрцам я з табой,
І ні адно з сусветных дзіваў
Не затуманіць вобраз твой.
**Л. Кебіч**

## Ход мерапрыемства

**1. Арганізацыны этап.**




*Стварэнне воблака слоў. Сумесна з вучнямі высвятляем тэму ШАГа.*

Якім словам мы называем край, у якім нарадзіліся і жывем?

Радзіма – гэта краіна, дзе ты жывеш; хата, дзе нарадзіўся; бярозка, у роднага ганка; месца, дзе жылі твае продкі, сцяжынка, па якой вучыўся хадзіць. Гэта ўсё разам узятае і лічыцца радзімай, г. зн., роднае месца.

У кожнага чалавека ёсць вельмі блізкае і дарагое месца, дзе ён адчувае сябе спакойна і ўпэўнена, яго малая радзіма. У адных - гэта вялікі горад, у другіх - маленькая вёсачка.

У кожнага чалавека ёсць Радзіма, і кожны любіць яе. Любіць месца, дзе нарадзіўся і жыве. Любіць родную прыроду, свой народ. Любіць сваю родную мову і песні свайго народа. У адной з кніг Францыск Скарына пісаў: “Звяры, што ходзяць у пустыні, знаюць ямы свае, птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнезды свае, рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае, гэтак жа  і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормленыя, да таго месца вялікую ласку маюць”.

З самага ранняга дзяцінства мы вучымся любіць сваю Радзіму. Разам са словамі “мама”, “тата” мы вымаўляем словы “наша хата”, “наша вуліца”, “наша вёска”, пасля мы кажам “наша школа”. Наша – гэта значыць “родная, свая”. І само сабой становіцца зразумелым, што наша – лепшае, таму што без яго немагчыма ўявіць само жыццё.




- Ёсць паняцці “Малая і вялікая Радзіма”. Як вы думаеце, чым адрозніваюцца гэтыя паняцці? (вучні выказваюць свае меркаванні).

**МАЯ** – таму што тут мая сям'я, мае сябры, мой дом, мая вуліца, мая школа…

**МАЛАЯ** – таму што гэта маленькая часцінка маёй неабсяжнай краіны.

**РАДЗІМА** – таму што тут жывуць родныя майму сэрцу людзі

**2. Асноўны этап**

- Каб больш даведацца аб сваёй малой Радзіме, мы здзейснім сёння падарожжа. Кожны прыпынак дапаможа нам або ўспомніць тое, што мы ўжо ведаем, або даведацца нешта новае аб сваёй малой радзіме.

*(На дошцы лісткі з лічбамі, якія абазначаюць крокі. Пры праходжанні кроку, лічба перагортваецца і з'ўляецца літара. У выніку атрымліваецца слова Радзіма).*

**Прыпынак 1 (Р):** зірнём яшчэ раз на нашу “вялікую Радзіму” (прагляд відэаматэрыялу).

Віктарына

1. Як правільна называецца дзяржава у якой мы жывем?
2. Сталіца нашай рэспублікі?
3. Хто такі Францыск Скарына?
4. Самае вялікае возера Беларусі?
5. Калі мы адзначаем Дзень незалежнасці?
6. Самы буйны і старадаўні звер Беларусі?
7. Самыя буйныя гарады Беларусі?
8. Якія рэкі Беларусі вы ведаеце?
9. У якой вобласці мы жывём?
10. Галоўны горад нашай вобласці?

- А цяпер я прапаную адправіцца ў вандроўку па гарадах нашай краіны: вам трэба назваць гарады Беларусі (*дэманструюцца слайды — адзін з пытаннем, а другі з адказам*).

1. Горад Беларусі, які носіць жаночае імя (Ліда).
2. Горад, у якім схавалася слова “слон” (Слонім).
3. Горад, які першым прыняў бой у гады Вялікай Айчыннай вайны (Брэст).

4. Горад, які мае пушыстае імя (Пухавічы).
5. Горад, назва якога звязана з назвай пушнога звярка, які водзіцца ў Беларусі (Бабруйск).
6. Горад, які мае мужчынскае імя (Барысаў).
7. Гарады, назвы якіх адрозніваюцца толькі адной літарай (Мінск, Пінск).
8. Адзін з самых старажытных гарадоў рэспублікі (Полацк).
9. Горад, у гонар якога Сімяон Полацкі ўзяў сабе прозвішча (Полацк. Там ён нарадзіўся).
10. Старажытны горад, у якім нарадзіўся Ф. Скарына (Полацк).

**Прыпынак 2 (А):** Наступныя крокі, якія мы зробім па “малой Радзіме”. Якое месца для нас з’яўляецца “малой радзімай”? Мы шмат разоў хадзілі па вулачках нашага аграгарадка і здаецца, што ведаем іх вельмі добра. Я прапаную зірнуць на іх яшчэ раз зверху *(Фота).*

- Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад убачанага. *(Абмеркаванне)*

**Вучань1**

Малая Радзіма … правал паміж слоў,
Хоць нехта ў іх сплаў і паверыў;
Назваў хтосьці раптам святыню малой,
Аднёс яе ў шэраг памераў…
Існуе малы пералесак, лясок,
Палянка малая і поле…
А край, дзе ступіў ты найпершы свой крок,
Малым не бывае ніколі,
Існуе малая трава і лаза,
Крыніцы вузенькае ложа.
А край, дзе ты першае слова сказаў,
Малым называцца не можа.
Радзіма.у ёй да сканчэння вякоў
Прастору душа набывае.
Магчыма, бывае малая любоў,
Святыні малой не бывае.

Любоў кожнага чалавека да сваёй малой радзімы пачынаецца з адносін да самых блізкіх людзей – маці, бацькі, бабулі, з любові да свайго дома, вуліцы, на якой жыве, аграгарадка. Каб любіць сваю малую радзіму, яе трэба добра ведаць.

**Прыпынак 3. Анкета (ДЗ)**

**Анкета “Ці ведаю я сваю малую радзіму?”**

*Інструкцыя: абярыце адзін або некалькі адказаў.*

**1. Ці ведаеце вы гісторыю жыцця вашых сваякоў (імя па бацьку, род дзейнасці, месца жыхарства)?**

- ведаю ўсё пра сваіх бацькоў;
- ведаю ўсё пра сваіх бацькоў і бабуль-дзядуль;

- ведаю пра сваіх бацькоў, бабулях-дзядулях, прабабулях-прадзедаў;
- цяжка адказаць;
- валодаю інфармацыяй часткова.

**2. Ці з'яўляецеся вы карэнным жыхаром свайго аграгарадка (3 і больш пакаленні вашай сям'і пражывалі ў гэтым сяле)?**

- так
- не
- цяжка адказаць

**3. Ці ведаеце вы знакамітых землякоў?**

- не ведаю
- ведаю (укажыце)________________________________________________

**4. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй вёскі?**

- асаблівасці мовы
- традыцыі святаў
- асаблівасці мясцовага касцюма
- легенды, казкі, паданні
- іншае

**Прыпынак 4. (І) "Вандроўка па Ганцавіцкаму раёну"** (прагляд відэароліка https://www.youtube.com/watch?v=g2IZLO7BWyo)
Абмеркаванне відэароліка

**Прыпынак 5 (М) "З гісторыі вёскі Кукава". (***Вучні дзеляцца сваімі ведамі аб гісторыі вёскі, яе жыхарах).*

Напісанне міні-сачынення "За што я люблю сваю маленькую радзіму", зачытванне работ.

**Прыпынак 6.(А) "Спяваем разам"**

Песня "Малая радзіма".

(http://www.zviazda.by/be/news/20180703/1530632198-pes) Вершы - Уладімір Мазго, музыка - Яўген Ксяневіч.

**3. Падвядзенне вынікаў**

Я прапаную кожнаму узяць у руку атрыманае раней каляровае сэрца.

- Дзеці, а ці гатовы вы падарыць свае сэрца Радзіме, месцу, дзе вы нарадзіліся, дзе жылі вышы продкі, дзе жывуць вашы бацькі, родныя людзі? *(дзеці адказваюць).*

- А якая яна, наша Радзіма, наша Беларусь*? (дзеці разважаюць*)

- Я прапаную кожнаму з вас адным словам *(прыметнікам)* ахарактарызаваць Беларусь. Якая яна, наша Радзіма? *(запісаць гэта слова на сэрцы).*

- Вось і падышло да канца наша маленькае падарожжа з 6 крокаў па вялікай і малой радзіме. Я думаю, што ў выніку нашага падарожжа вы зрабілі для сябе невялікія адкрыцці, даведаліся нешта новае. Падзяліцеся сваімі думкамі. *(Дзеці выказваюць свае меркаванне аб тым, што даведаліся).*

Я спадзяюся, што сустрэча з традыцыямі, звычаямі роднай зямлі абавязкова працягнецца, калі мы таго пажадаем, і на ўроках, і ў жыцці, бо мы – Беларусы, мы памятаем мінулае, мы ўдасканальваем сучаснае і будзем ствараць будучае.

Таму, што наша Радзіма – Беларусь суверэнная..... *(дзеці працягваюць характарызаваць, называюць словы, падыходзяць да дошкі і прымацоўваюць сваё сэрца на карту Беларусі").*




**4. Рэфлексія.**

«Свабодны мікрофон»

а) Мая радзіма – гэта…

б) Я удзячны(а) своей дзяржаве за тое, што…

в) Мне хацелася б, каб мая Радзіма была самай… (5-10 прыметнікаў)

г) Калі вырасту, я …

Памятайце, ад кожнага з нас залежыць, якой будзе наша дзяржава. І кожны сам павінен задаць сабе пытанне: што асабіста я магу зрабіць для Радзімы? Усім вам я хачу сказаць вялікі дзякуй. Вы сапраўдныя жыхары сваёй малой радзімы.

Выкарыстаныя крыніцы:

https://praleska-red.by/social/god-maloj-rodiny/

https://botana.biz/prepod/nachalnye_klassy/ozvazp3o.html

https://pedportal.by/baza-materialov/vospitatelnaya-rabota/vospitatelnoe-meropriyatie-ya-vyiros-zdes-i-kraj-mne-eto-dorog

https://pedportal.by/baza-materialov/vospitatelnaya-rabota/blok-zanyatka-umelczyi-nashaga-agragaradka

*Пабудзей Таццяна Іванаўна,*

*класны кіраўнік 7 класа*
*ДУА “Кукаўская сярэдняя школа”*
*Ганцавіцкага раёна*